# Калейдаскоп

**май 2021**

**Школьная газета №9(29)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*



*Паклон табе, мой беларускі краю!*
*Ты — мой, я — твой: ад роду і навек.*
*Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю*
*Твой ліст дубовы — як чароўны лек.*
*За хлеб, што ем, за песні, што спяваю,*
*За шчасце звацца іменем тваім –*
*Паклон табе, мой беларускі краю!*
*Ты — мой, я — твой: усюды і ва ўсім!*

*Ніл Гілевіч*



---



# Паэты і пісьменнікі пра мову

Калейдаскоп
май 2021

**Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову. (Я. Колас)**

**Я - беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пераліvы
І зблізку чую, і здаля. (Н. Гілевіч)**

**Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. (Я. Сіпакоў)**

**Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім. (М. Танк)**

**Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была, як агонь. (П. Броўка)**

**Мова - гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ. (І. Мележ)**

**Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму - на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае - гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць - калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны - гэта родная мова. (З. Бядуля)**

**Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоў-бацькоў, якія той жа мовай гаварылі. (В. Ластоўскі)**

**Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю. (Ф. Багушэвіч)**

**Я закаханы ў матчыну мову, а ёю пахнуць хлеб і малако. (С. Грахоўскі)**

# Паэты і пісьменнікі пра мову

Калейдаскоп
май 2021

Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. (Цётка)

Роднае слова - гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет. (Я. Колас)

Якія цудоўныя назвы і словы,
Якая цудоўная родная мова!
І ўсё мілагучна для слыху майго:
І звонкае "дзе", і густое "чаго". (П. Панчанка)

Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю. (Я. Колас)

Багата, родная ты мова,
Цябе стварыў і ўзнёс народ.
А вобразы якія ў словах,
А параўнанняў што за ўзлёт! (П. Броўка)

Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова! (У. Дубоўка)

Ігнараваць мову - гэта значыць ігнараваць народ, нацыю.
(П. Пестрак)

Мова родная, мова дзядоў!
Іншай мовы мы ў сэрцы не чуем.
Мілагучнасцю любых нам слоў,
Быццам музыкай, душы чаруем. (Л. Геніюш)

Дала мне маці гэту мову,
Каб не нямым пайшоў у свет,
Дала мне маці гэту мову,
Як спадчыну і запавет. (А. Пысін)

Ад абразы, ад позірку злога,
Шлях заблытаўшы для наслання,
Неруш ранішні - матчына слова
Мне, як бору, цябе засланяць? (Р. Барадулін)
Пароль неўміручасці - родная мова. (П. Макаль)

# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**май 2021**

**Вяртанне да вытокаў**

**3 мая** вучні **4«В»** класа ў рамках праекту **«Вяртанне да вытокаў»** удзельнічалі ў тэатральна-гульнёвай праграме **«Фарбы беларускай хаткі»**. Пры правядзенні праграмы вучні пазнаёміліся з  прадметамі быту, укладам жыцця беларускага народа, змаглі прыняць удзел у гульнях і ўбачыць цацкі далёкіх продкаў. Шмат новага і цікавага даведаліся вучні чацвёртага класа.

**Класны кіраўнік 4«В» класа**









# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**май 2021**

## Музычная кампазіцыя «Ваша слава ўстане абеліскам»

**6 мая** ў рамках папулярызацыі роднай мовы для вучняў **5«Б»** класа прайшла літаратурна — музычная кампазіцыя **«Ваша слава ўстане абеліскам»**, дзе вучні пазнаёміліся з творамі беларускай літаратуры, якія прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Дзеці давалі ацэнку прачытаным творам, распавядалі гісторыі з уласнай сям'і пра дзядуль і бабуль, якія бачылі вайну. Важна, каб школьнікі разумелі, якія страты прынесла вайна і хто змагаўся за мірнае жыццё.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т. М.**





# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**май 2021**

### Пазакласнае мерапрыемства « Вобразы роднай Беларусі»

**13 мая** ў межах папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры **для вучняў 6 «Б» класа** прайшло **пазакласнае мерапрыемства «Вобразы роднай Беларусі».** Вучні падрыхтавалі паведамленні па дадзенай тэме і выступілі перад класам. Цікава было даведацца, што шматлікія вобразы знайшлі сваё адлюстраванне і ў вышыўцы. Па малюнках дзеці вызначалі вобразы-сімвалы, апісвалі фарбы, якімі яны прадстаўлены, прыводзілі параўнанні з падобнымі прадметамі. Мерапрыемства атрымалася цікавым і пазнавальным.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С.А.**





# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**май 2021**

**Экскурсія ў музей этнаграфіі**

**24 мая ў межах папулярызацыі** роднай мовы і народных традыцый **вучні 6 «А»** наведалі музей этнаграфіі. Для дзяцей была праведзена аглядавая **экскурсія па тэме « Зямлі роднай кругавод»**. Вучні з цікавасцю слухалі пра жыццё і побыт нашых продкаў, пра традыцыі, пра народныя святы. Дзеці ўбачылі элементы ўбрання вясковых хат, прылады працы, узоры паўсядзённага і святочнага адзення. Вучням прадэманстравалі працу на ткацкім станку. З вялікім захапленнем дзеці слухалі аповед экскурсавода і задавалі свае пытанні.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юрчанка С. А.**






# Літаратурная старонка



## О май, - пара кахання

О май, - пара кахання.
У шлюбным вэлюме прырода.
Шалеюць птушкі ад світання
Любоўным спеўным хараводам.

Ад сонечнага пацалунку
І водар квецені духмяны.
Яна - найлепшыя дарункі
Для душ і сэрцаў закаханых.

А набухлыя пялёсткі –
Як прыгажунь хмяльныя губы.
Што ў гарадах, мястэчках, вёсках
Хлапцоў прыводзяць да загубы.

І млее сэрца ў час вясновы.
І закаханым не заснуць –
Губляюць рэчы і галовы.
Хмяльную брагу маю п’юць.

Усё – і людзі, і прырода-
У чарах светлых пачуцця.
Благаславенне Бога Рода
На шчасце і працяг жыцця.

**Ніна Аксёнчык**



# Юбілейныя даты



## 1мая 90 гадоў з дня нараджэння Алега Лойкі



Алег Антонавіч Лойка (01.05.1931, г. Слонім, Гродзенскай вобл. – 19.11.2008), літаратуразнавец і паэт. Скончыў Белдзяржуніверсітэт (1953). У 1956 – 1985 гг. старшы выкладчык, дацэнт, прафесар, з 1985 г. загадчык кафедры Белдзяржуніверсітэта.Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1989), доктар філалагічных навук (1970), прафесар (1971).

Навуковыя даследаванні прысвечаны гісторыі беларускай літаратуры, пытанням тэорыі сучаснай паэзіі. Даследуе заканамернасці развіцця нацыянальнай лірыкі і паэмы, праблемы рэалізму і рамантызму, пытанні літаратурных сувязяў. Унёс вялікі ўклад у вывучэнне тыпалагічных сувязяў беларускай і польскай літаратур. Даследаваў генетычныя і працэсуальныя асаблівасці развіцця новай беларускай літаратуры 19-пачатку 20 стагоддзя. Вывучаў творчасць М. Багдановіча, шляхі развіцця і мастацкі фенамен нацыянальнай паэмы і лірыкі. З пачатку 1980-х гадоў вывучае даадраджэнчаскі і адраджэнскі перыяды старабеларускай літаратуры. Друкуецца з 1951 г. пераклаў на беларускую мову творы П. Верлена (зборнік "У месяцавым ззянні", 1974), І.В. Гётэ (зборнік "Спатканне і ростань", 1981), Ф. Шылера (зборнік "Улада песняспеву", 1997), многіх рускіх, украінскіх, польскіх і інш. паэтаў. Аўтар звыш 100 навуковых прац, у т.л. 6 манаграфій, двухтомнага падручніка для філалагічных факультэтаў універсітэтаў "Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычнікі пэрыяд" (ч. 1-2, 1977-80, 2-е выд. 1989), двух кніг у серыі ЖЗЛ "Янка Купала" (1982), "Скарына"(1989), 24 кніг вершаў.

Дзяржаўная прэмія БССР 1990 г. за раман "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае". Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў (1981), медалямі.

Асноўныя працы: «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура». Мн., 1959;

«Новая зямля»Якуба Коласа: «Вытокі, веліч, хараство». Мн., 1961; Максім Багдановіч. Мн., 1966; «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя». Мн., 1972;

Паэзія і час. Мн., 1981; «Як агонь, як вада... » : Раман-эсэ пра Янку Купалу. Мн., 1984; «Скрыжалі»: Выбранае. Мн., 1984; «Сонца маладзіковае»: Раман-эсэ. Мн., 1990; Збор твораў. Т. 1-2. Мн., 1992.

# Юбілейныя даты



## 15 мая 85 гадоў з дня нараджэння Барыса Сачанкі




**Сачанка Барыс Іванавіч** (15.05.1936, в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці – 05.07.1995, Мінск, пахаваны на Усходніх могілках) – празаік, перакладчык і выдавец. Член СП Беларусі з 1960. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1982, за кнігу «Ваўчыца з Чортавай Ямы»), Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя І. Мележа (1991, за кнігу «Сняцца сны аб Беларусі...»). Барысу Сачанку не было і шасці гадоў, як пачалася Вялікая Айчынная вайна. У 1943 фашысты спалілі Вялікі Бор, у агні загінула 128 аднавяскоўцаў, астатніх жыхароў вёскі вывезлі ў Нямеччыну. Сям'я Сачанкаў трапіла на ферму нямецкага землеўласніка, дзе давялося працаваць да самага вызвалення ў маі 1945. Затым трапілі ў лагер для перамешчаных асоб, якіх амерыканцы агітавалі ехаць у ЗША, але Сачанкамі валодала жаданне хутчэй вярнуцца дамоў, на Палессе. У 1945 Б. Сачанка пайшоў у першы клас Вялікаборскай сямігодкі, а пасля заканчэння Хойніцкай СШ, у якой вучыўся Іван Мележ, у 1955 паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, якое скончыў у 1960. Працоўную дзейнасць пачаў у 1958 у часопісе «Вожык» – спачатку карэктарам, затым фельетаністам. Тут пад псеўданімам І. Сібарсач змяшчаў вострыя і надзённыя крытычныя нататкі, артыкулы, гумарэскі, сатырычныя замалёўкі. Затым працаваў рэдактарам аддзела прозы часопіса «Полымя» (1960-1976), дзе яму першаму давялося чытаць і рэдагаваць «Палескую хроніку» І. Мележа. У 1976-1986 сакратар праўлення СП Беларусі. У 1986-1993 загадчык аддзела перакладной замежнай літаратуры выдавецтва «Мастацкая літаратура». З 12.01.1993 - галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі.

# Юбілейныя даты



## 15 мая 85 гадоў з дня нараджэння Барыса Сачанкі

Першае апавяданне Б. Сачанкі «Плынь» надрукавана ў часопісе «Маладосць» у 1956. Падзеі яго звязаны з жыццём і працай калгаснай моладзі 1950-х гадоў. Раннія навелы празаіка друкаваліся на старонках часопісаў «Беларусь», «Полымя», многіх газет.

Першы зборнік яго апавяданняў «Дарога ішла праз лес» выйшаў у 1960 годзе. Другі эборнік апавяданняў «Барвы ранняй восені» выйшаў у 1961 годзе. Асабліва вылучаецца пастаянная тэма, звязаная з «малой радзімай» пісьменніка – ёй прысвечаны цыкл «Палессе». Гістарычнае мінулае палескага краю паказана ў аповесцях «Варэйка золата», «Англіцкая сталь», «Дыярыуш Мацея Белановіча». У многіх творах празаіка раскрываюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны («Палон» «Пакуль не развіднела», «Аксана», «Загадка аднаго падполля», раман у навелах «Чужое неба», трылогія «Вялікі Лес»). Адным з першых у беларускай прозе Б. Сачанка пачаў распрацоўваць тэму Хатыняў (аповесць «Апошнія і першыя»). У апавяданнях і аповесцях 1970-х гадоў пісьменнік разглядае многія аспекты сучаснага гарадскога побыту, выкрывае спажывецкія адносіны да жыцця («Мара», «Успамін», «Пра аднаго паэта», «Не на той вуліцы», «Запіскі Занядбайлы», «Іван Патапавіч Белахвосцік – кніжны Шэрлак Холмс», «Без пяці мінут «прахвесар»). Не абышоў Б. Сачанка і горкую тэму Чарнобыля, якой прысвяціў «Запіскі аб радыяцыі», аповесці «Родны кут» і «Еўка». Аўтар зборнікаў сатыры і гумару «Вол-фігурыст», «Халасцяк», кніг для дзяцей «Кошык малін» і «Бабка Адарка». У кнізе Б. Сачанкі «Жывое жыццё» змешчаны артыкулы пра творчасць Л. Талстога, І. Буніна, К. Паустоўскага, Міхася Лынькова, І. Мележа, С. Дзяргая, пра жыццё і творчасць Я. Купалы і інш. Пісаў артыкулы пра беларускую эміграцыю, рэпрэсіраваных пісьменнікаў, пра грамадска-літаратурны рух 1920-1930-х гадоў (кніга «Сняцца сны аб Беларусі»). У 1980пабываў у З Ш А. Вынікам гэтай паездкі з’явіліся нарысы «Куды ты ідзеш, Амерыка?». Напісаў таксама нарысы пра свае паездкі ў Галандыю («У краіне польдэраў і цюльпанаў»), у Польшчу і Чэхаславакію («На зямлі беластоцкай», «Па слядах Скарыны»), у Францыю («Восень у Парыжы»). Апублікаваў са сваімі каментарыямі малавядомыя ці зусім невядомыя творы Я. Купалы, Я. Коласа, В.Ластоўскага, К. Сваяка, Л. Геніюш, У. Жылкі, У. Клішэвіча, А. Салаўя і інш. Пераклаў на беларускую мову аповесці іншых пісьменнікаў.

# Юбілейныя даты



## 16 мая 110 гадоў з дня нараджэння Васіля Віткі




**Вітка Васіль** (сапр. Крысько Цімох) нарадзіўся 16.05.1911 года ў вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Менскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Слуцкай прафтэхшколы (1928) працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, у заводскай шматтыражцы (1929-1930), рэдакцыях газет «Камуніст» (Бабруйск, 1930-1933), «Ударнік» (Жлобін, 1933-1935), «Чырвоная змена» (1935-1937), «Літаратура і мастацтва» (1937-1938) і часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1938-1939). Удзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і да самага пачатку вайны працаваў сакратаром Беластоцкага абласнога аддзялення СП БССР. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны - у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», а з 1942 г. - у аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК КПБ рэдактарам масавых выданняў для акупіраваных раёнаў. Супрацоўнічаў у сатырычных часопісах «Партызанская дубінка» і «Раздавім фашысцкую гадзіну». З дня ўтварэння часопіса «Беларусь» (студзень 1944) працаваў яго адказным сакратаром, з 1948 г. - намеснікам, з 1951 г. - галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1957-1974 гг. - галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». У 1974-1987 гг. - сябра сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». Сябра СП СССР з 1943 г.

Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума - «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1970).

Памёр 05.07.1996 г.

## 16 мая 110 гадоў з дня нараджэння Васіля Віткі

Друкавацца пачаў у 1928 г. Першы зборнік вершаў «Гартаванне» выдадзены ў 1944 г. у Маскве. Затым выйшлі зборнікі паэзіі «Поўдзень» (1946), «Вернасць» (1953), «Ружа і штык» (1958), «Паверка» (1961), «Вершы» (1968), «Беларуская калыханка» (1971), «Праводзіны лета» (1972), «Вышыні святла» (1977), «Случчына» (1981), «Трэція пеўні» (1988), зборнік сатыры і гумару «Для дома, для альбома і трохі для эпохі» (1983). Для дзяцей выдаў кніжкі паэзіі і вершаваных казак «Вавёрчына гора» (1948), «Буслінае лета» (1958), «Казка пра цара Зубра» (1960), «Дударык» (1964), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1965), «Казкі» (1968, 1976), «Чытанка-маляванка» (1971), «Хто памагае сонцу» (1975), «Ладачкі-ладкі» (1977), «Мы будуем метро» (1979), «Мінскія балады» (1982), «Казкі і краскі», «Госці», «Загадка пра зярнятка» (усе 1984), «Дзецям» (выбраныя творы ў дзвюх кнігах, 1986), «Свята дружбы» (1987), зборнік апавяданняў «Зайчык-вадалаз» (1962). У 1973 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Аўтар п'ес «Прамень будучыні» (1948), «Шчасце паэта» (1951, пастаўлена ў 1952).

Напісаў многа літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў на маральна-этычныя і выхаваўчыя тэмы. У 1977 г. выдаў кнігу дзённікаў, нарысаў і апавяданняў «Дзеці і мы», у 1982 г. - кнігу «Урокі», у 1988 г. - «Азбука душы». Адзін з аўтараў чытанак «Роднае слова» для 1 (1969), 2 (1970) і 3 (1988) класаў.

На беларускую мову пераклаў паэму Ў.Маякоўскага «Добра!» (1940, з Р.Лыньковым), «Паны Галаўлёвы» М.Салтыкова-Шчадрына (1956), кнігу В.Сухамлінскага «Блакітныя жураўлі» (1971), творы расейскіх, украінскіх, латышскіх, балгарскіх і польскіх пісьменнікаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972) за кнігі «Беларуская калыханка», «Казкі» і «Чытанка-маляванка». У 1978 г. узнагароджаны міжнародным ганаровым дыпломам імя Х.К.Андэрсена з занясеннем прозвішча пісьменніка ў Ганаровы спіс дацкага казачніка.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**май 2021**

**Май ці травень**



Для пятага месяца ў нас выкарыстоўваюцца дзве гэтыя раўнапраўныя назвы. Першая ўзнікла ў дахрысціянскія часы. ***Маем*** (ад лац. *Maius*) тады называлі міфічную істоту, што нагадвала старажытнарымскую багіню вясны *Мáю*, якая ўпрыгожвала зямлю травамі. Затым так сталі абазначаць першую зяляніну дрэў, якой упрыгожвалі хаты на Сёмуху. Выраз «Умаіць хату» абазначаў 'прыбраць зеленню'. Пасля традыцыя іменаваць рытуальную зелень перайшла на назву месяца.

Назоўнік ***травень*** — праславянскі. Утвораны ад *трава*, ён рэдка ўжываўся ў старабеларускі перыяд, а за савецкім часам лічыўся састарэлым. Толькі ў канцы XX ст. яго прызналі літаратурным для беларускай мовы.

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**май 2021**



# ТРАВЕНЬ (МАЙ)

| Этымалогія назвы | Народныя прыкметы месяца | Беларускія каляндарныя святы |
|---|---|---|
| Сучаснай літаратурнай назве месяца "май" адпавядае старабеларуская форма "травень", якая паходзіць ад слова "трава", бо ў гэтым месяцы зямля пакрываецца зяленню. | Май – жывёлу ў поле пхай.<br>Май – валам дай, а сам на печ уцякай.<br>Май халодны – год галодны.<br>Аўсей – авёс сей. | 6 – Юрый (Ягорый, Георгій)<br>7 – Сава<br>15 – Дзень Барыса і Глеба<br>22 – Мікола веснавы<br>24 – Дзень Кірыла і Мяфода<br><br>Радаўніцы |

Рэдкалегія: Аліева Анастасія (8в), Кузьміна Кацярына (8в), Прасаловіч Юлія (8в), Сарокіна Вікторыя (8в), Федарэнка Вікторыя (8в).
Рэдактар Юрчанка С. А.